**Ян Балабан**

**(Jan Balabán)**

# Тэрарыстка
# (Teroristka)

– Ці можа існаваць нявінная карціна? Што гэта за пытанне? Што значыць нявінная? – Ганс азіраўся на карціны, якія віселі навокал.

– Карціна, якая б проста і шчыра адлюстроўвала рэчаіснасць, без іроніі і гіпербалы альбо іншых праламленняў, – развіваў сваю думку мастак Міхал.

– Пад словам “існаваць” ты, вядома ж, маеш на ўвазе, ці вартая нашая рэчаіснасць такой карціны, ці можа такая карціна ўзнікнуць у нашым грамадстве. Не ведаю. Але, так ці інакш, яна павінная дзесьці існаваць, проста на яе менавіта цяпер не свецяць пражэктары.

– Ты лічыш, што існуе сапраўдная нявіннасць?

– Не ведаю, але яна павінная была б існаваць, хоць бы дзеля жанчын.

– Ты так думаеш?

– Так!

Гансу цяжка даецца гэтая размова, бо ён ведае, што ў ім усё жыццё жыве жанчына. Нягледзячы на тое, што ён, несумненна, муж і бацька дзяцей, ён адчувае, што жаноцкасць – гэта аснова ўсяго ягонага светаўспрымання.

Пакуль Ганс быў малым хлопцам, у тым бесклапотным узросце, перад першым узбуджэннем, якое бесцырымонна кідае бездапаможнага падлетка ў свет сэксу, з якога няма вяртання, ён глядзеў на свет хутчэй матчынымі, чым бацькавымі вачыма і думаў, што так будзе заўсёды. Але гэта было немажліва. Як і ягонае марнае жаданне знайсці ў свеце такое месца, якога б ён не мусіў пакідаць, у якім мог бы застацца назаўжды. Таму Ганс аплакваў кожнае дрэва і камень, які мінаў на сваім шляху. Ён пакутаваў заўсёды, калі бацькі перастаўлялі ў доме мэблю, сумаваў па тым былым парадку, як па страчаным доме. У сталым узросце яму гэтаксама цяжка было расставацца са старымі месцамі жыхарства, нават з пакоямі ў гатэлях. Ганс падазраваў, што гэты неспакой нарадзіўся ў ім акурат тады, калі ён першым актам ананізму пакрыўдзіў тую прыўкрасную жанчыну, якая дагэтуль спакойна жыла ў ім.

Ганс не быў гомасэксуалістам, ані латэнтным, ані ніякім іншым. Яго не вабіла пераадзяванне ў жаночае адзенне. Наадварот, жаночыя атрыбуты на мужчынах былі яму агідныя, а пры позірку на травесці-шоў яго цягнула на ваніты; гэтыя лялькі з набітымі грудзямі і размаляванымі памадай вуснамі абражалі жанчыну, пра якую самі нічога не ведалі, жанчыну, якой быў таксама Ганс. На ваніты яго цягнула і ад парнаграфічных часопісаў. Ад самога сябе над гэтымі часопісамі, ад уласнай здрады – таннага позірку на жанчынаў, якія разводзяць ногі перад камерай, то бок перад усім светам. Калі Ганс купляў такі часопіс, выкарыстоўваў, а потым выкідваў у сметніцу, яму адкрывалася, што такое грэх. Не супраць Бога, то бок бацькі, бацька,

магчыма, і зразумеў бы яго, не, гэта быў грэх супраць яе, супраць той страчанай пачатковай істоты, якая жыве дзесьці ў лабірынце, у сістэме пячораў, якую нельга ўбачыць, а можна толькі адчуць, там, дзе жывуць нашыя прашчуры, з якімі нас злучае сувязь, тонкая, як нітка Арыядны...

– Гэтую нітку, вядома, можна парваць, але тады... – Ганс спыніўся, бо не ведаў дакладна, калі пачаў думаць услых.

– Што тады? Працягвай, – папрасіў яго Міхал.

– Тады? Тады мы зможам толькі маляваць піську на сцяне і рабіць выгляд, што знайшлі ўваход у пячору тварэння.

– Я б так не драматызаваў, – адказаў Міхал з прыкрай нязмушанасцю. – Я наадварот думаю, што кожная піська на сцяне і кожная дзяўчына з порначасопіса можа быць чымсьці накшталт алюзіі да тых пачатковых істотаў, пра якіх ты гаворыш. Страта нявіннасці – гэта факт, а страчаны свет ужо не вернецца. Ты проста зацяты рамантык, але і ты непаслядоўны. Калі б ты быў паслядоўны, як сапраўдны паэт, дык напісаў бы вялікі верш і памёр бы маладым. Перарваная нітка не дала б табе жыць далей! А ты замест гэтага сорак гадоў швэндаешся тут, як кажаш, у лабірынце, кахаеш жанчын, плодзіш дзяцей, ствараеш сем'і, як і ўсе мы, і яшчэ лічыш гэта няправільным. Гэта, Ганс, у найлепшым выпадку інфантыльны нарцысізм, у найгоршым – звычайная крывадушнасць, снабізм.

– Я думаў, што ты мастак, – злосна адказаў Ганс, – але ты яшчэ і псіхолаг, табе яшчэ нестае люлькі, каб яе вычышчаць, пакуль я тут адкрываю перад табой душу. Я ведаю, у цябе, напрыклад, з парнаграфіяй няма праблемаў, ты ёй натхняешся на свае карціны. Цяпер гэта модна. Чаму ты і ўсе астатнія мастакі жыць не можаце без парнухі?

– Не ведаю, без чаго не могуць жыць іншыя мастакі, а ў мяне з парнаграфіяй ёсць праблемы, таму я ёй і карыстаюся. Яна мне здаецца неверагоднай. Я нават саромеюся гэтых часопісаў. Таму купляю толькі тыя, што залітаваныя ў поліэтылен, я не давяраю гандлярам з кіёскаў і выпадковым людзям. Хто ведае, што яны з імі робяць. Мяне мучыць страх, каб не падчапіць якой хваробы. Яны ідуць разам, небяспека і дзіўная, удаваная нармальнасць усіх гэтых практык. Я малюю гэтыя абсурдныя сітуацыі і позы, каб неяк іх выказаць, выцягнуць на свет, каб я сам мог спакойна паглядзець на гэтае вар'яцтва.

– Вар'яцтва замяняе сабой свет, – злаваўся Ганс, – цяпер усё абавязкова мусіць быць вывіхнутым з катушак, абсмяяным і раскладзеным як на вітрыне. Я табе нешта скажу. Вы ўжо не малюеце карціны. Вы малюеце рэкламы карцін, і скончыце вы ўсё таксама ў рэкламе, а пасля будзеце цішком у прыбіральні разглядаць, напрыклад, Мунка, і казаць: "Бля, вось гэта рэч".

– Ну вядома, але цябе гэта не тычыцца, бо ты высакародна трызніш пра пачатковых істот.

Ганс не адказваў. У ягонай галаве ўзнік вобраз хударлявай дзяўчыны, якая сядзела на крывава-чырвонай канапе. Яна глядзела яму проста ў вочы і

пераносіла яго прэч з гэтай размовы ў свет чыстага болю, супраць якога яны з сябрам мастаком былі бездапаможныя, як малыя дзеці.

Калі ў навінах з’явілася паведамленне пра чачэнскую тэрарыстычную групу ў маскоўскім тэатры, у Гансу зноў штосьці заварушылася, нібыта працягнулася толькі на імгненне перарваная размова. Страх мацнее. Тэатральная публіка апынулася перад аўтаматамі адчайна рашучых змагароў, якім няма чаго губляць, а таму яны пагражаюць смерцю бязвінным жанчынам, і дзецям, і мужчынам, за тое, што іхнія бязвінныя жанчыны, і дзеці, і мужчыны, даўно ўжо загінулі пад бомбамі ў Грозным. Наўкол тэатра размяшчаецца няўклюдны рускі вайсковы механізм. Усе ведаюць, што перамоваў не будзе. Гэта Вялікі тэатр, і сцэна ў ім выглядае так: унутры цеснае спляценне запалоханых і адчайна рашучых, наўкол іх аддзелы абыякавых сілавікоў, якія чакаюць загаду, а ў знешнім коле – бездапаможныя людзі, якія ні на што не маюць уплыву.

У глядацкай зале, проста сярод закладнікаў, сядзяць чачэнскія жанчыны, жонкі забітых таварышаў, у іх на целах прымацаваная выбухоўка, а рукі сціскаюць дэтанатары. Якраз яны і павінныя стацца ў выпадку невыканання невыканальных умоваў смяротнай зброяй.

Ганс і Міхал і іншыя людзі, якія ні на што не маюць уплыву, у пакутлівых размовах марна спрабуюць знайсці хоць бы намёк на правільнае вырашэнне гэтай вар’яцкай і вывіхнутай з усіх катушак сітуацыі.

Потым адбываецца штурм. Спецназаўцы ломяць сцяну і пускаюць унутр газ, які забівае большую частку людзей унутры. Жаўнеры ў газаахоўніках пасля на месцы дабіваюць усіх тэрарыстаў і тэрарыстак, а пасля гэта ўжо толькі руская руціна – людзі задыхаюцца і паміраюць у перапоўненых машынах хуткай дапамогі, ваенныя хімікі адмаўляюцца паведаміць лекарам склад атрутнага газу, крэўныя марна шукаюць сваіх зніклых... Перамога дасягнутая коштам вялікіх стратаў.

– Толькі тыя зарады не ўзарваліся.

– Мабыць, тэрарысткі былі паралізаваныя раней, чым змаглі прывесці іх у рух.

– Тады чаму ім усім прастрэлілі галовы?

– Мабыць, для пэўнасці.

– Але гэта ідыятызм. Пакуль газ разышоўся, прайшло некалькі секундаў. Людзі нацягвалі на галовы адзенне, залазілі пад крэслы. Колькі секундаў трэба, каб націснуць на кнопку?

– Ты думаеш, што яны ўсё ж былі міласэрнымі?

– Бог ведае, як там было, але я думаю, што калісьці яно абавязкова выбухне.

Праз некалькі тыдняў пасля штурму Міхал запрасіў Ганса да сябе ў майстэрню, і яны зноў размаўлялі пра нявінную карціну.

– Вось гэтая магла б цябе зацікавіць, – сказаў Міхал і перавярнуў карціну, абапёртую на сцяну.

Жаночая галава выступае з-пад шэрага брызенту. Ад цёмных валасоў разліваецца лужына крыві.

– Мёртвая тэрарыстка. Я напісаў яе паводле фота ў газетах, – пад-зелавому сказаў Міхал.

– Ганс нахіліўся да самага палатна, нібыта так хацеў лепш разгледзець ейныя рысы.

– Толькі вось на каго яна падобная? – спытаўся Ганс нібыта ў самога сябе.

– Дык на цябе ж, – разгублена прамовіў Міхал.

– На мяне?

– Мне хацелася, каб яна была на цябе падобная.

– Вось тут ты ўгадаў, – адказаў Ганс і замоўк на хвіліну.

– Ты прадасі мне гэтую карціну?

– Ну, я так і ведаў, што ты яе захочаш, але нельга, яна ўжо прададзеная, і халерна добра прададзеная.

– Хто яе купіў?

– Адзін багацей, уладальнік нейкіх клубаў, заплаціў і сказаў, што забярэ адразу ж, але мне хацелася, каб ты яе пабачыў, таму па яе прыйдуць заўтра.

– А чаму менавіта гэтую, у цябе ж тут ёсць і лепшыя карціны для клуба.

– Ён хацеў толькі гэтую, казаў, што гэта адпад і крута мець такую карціну ў бары.

– Добра, будзем хадзіць туды і глядзець на яе, хоць я і ненавіджу клубы, – з жалем сказаў Ганс і напаследак зазірнуў у мёртвыя вочы, якія пераносілі яго ў свет чыстага болю.

*Пераклала з чэшскай Святлана Рогач*